# Бібліяграфічная прадукцыя па сельскай гаспадарцы

*В. А. Касап, Р. А. Ровіна*

За апошнія пяць год (з 2000 па 2005) бібліяграфічная прадукцыя па сельскай гаспадарцы развівалася ў тых жа накірунках, што і ў папярэднія гады. Паступова скарачаецца колькасць самастойных форм бібліяграфічных паказальнікаў, адбываюцца змены ў іх відавым складзе. Як і ў папярэднія гады, перавага ў патоку бібліяграфічнай прадукцыі аддаецца біябібліяграфічным паказальнікам, прысвечаным вядомым навукоўцам і педагогам (2918, 2919 (2001 г.), 3094, 3289 (2002 г.), 1948, 2598, 4152, 4180 (2004 г.)). На іх долю прыпадае каля 70% усёй бібліяграфічнай прадукцыі. Другой па колькасці групай з'яўляюцца бібліяграфічныя паказальнікі прац асобных калектываў (2974, 2987 (2001 г.), 3226 (2002 г.)) – каля 20%. Неабходна адзначыць таксама з'яўленне аналітычных аглядаў па праблемах АПК – каля 6%, а таксама інфармацыйных спісаў навуковых распрацовак, якія рэкамендаваны да выкарыстання – 4%. Большасць паказальнікаў з'яўляецца самастойнымі выданнямі, хаця ёсць прыклады іх размяшчэння ўнутры кніг (прысвечаныя А. С. Дзевятаву (4180 (2004 г.)), В. І. Шэмпелю (4155 (2004 г.)). Па-ранейшаму ў патоку бібліяграфічнай прадукцыі пэўную колькасць складаюць значныя прыкніжныя спісы літаратуры. Падрыхтоўкай самастойных форм бібліяграфічнай прадукцыі займаліся ў гэты перыяд бібліятэкі вышэйшых навучальных устаноў, навукова-даследчых інстытутаў, Інстытут укаранення новых форм гаспадарання ў АПК і некаторыя іншыя. Складзеныя і выдадзеныя біябібліяграфічныя паказальнікі прысвечаны акадэмікам І. С. Нагорскаму (2918 (2001 г.)), М. І. Смеяну (3289 (2002 г.)), выдатным вучоным аграрнай навукі і педагогам А. С. Дзевятаву (4180 (2004 г.)), В. Ф. Карлоўскаму (4152 (2004 г.)), А. М. Карташэвічу (3094 (2002 г.)), Ф. К. Курапаценку (1948 (2004 г.)), С. І. Назараву (2919 (2001 г.)), А. Р. Цыганову (2598 (2004 г.)) і іншым вучоным. Нягледзячы на шырокае распаўсюджванне ў апошнія гады гэтага віда бібліяграфічных паказальнікаў, яны адрозніваюцца і структурай, і прынцыпамі адбору матэрыяла і яго групоўкай. Так, напрыклад, па класічнай методыцы падрыхтаваны біябібліяграфічныя паказальнікі, складзеныя ў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі (2919 (2001 г.), 3289 (2002 г.), 1948, 2598 (2004 г.)). Усе яны ўключаюць наступныя раздзелы: біяграфічная даведка/нарыс, спіс навуковых прац вучонага па гадах (пры гэтым магчыма выдзяленне асобных відаў навуковай прадукцыі), спіс дысертацый, якія выкананы пад кіраўніцтвам вучонага. У канцы паказальніка звычайна прыводзіцца алфавітны спіс сааўтараў. Разам з тым, у некаторых выданнях не выдзяляецца біяграфічны нарыс, які замяняецца ўводзінамі (прысвечаны В. Ф. Карлоўскаму) (4152 (2004 г.)). У біябібліяграфічных паказальніках, прысвечаных найбольш вядомым асобам сваёй галіны, напрыклад, С. І. Назараву (2919 (2001 г.)), дадаткова прыводзяцца: водгукі пра акадэміка, спіс падрыхтаваных ім навуковых кадраў, створаныя навуковыя школы, літаратура аб жыцці і дзейнасці. У такія працы магчыма ўключэнне і фотадакументаў, і архіўных матэрыялаў, што не будзе парушаць агульнапрынятую методыку.

Другая група – бібліяграфічныя паказальнікі прац калектываў. За апошнія пяць год яны адлюстроўвалі навуковыя працы супрацоўнікаў Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі "Библиографический указатель работ сотрудников Института леса НАН Беларуси (БелНИИЛХ)" (1922–2000 гг.) (3226 (2002 г.)), Навукова-даследчага інстытута меліярацыі і лугаводства "Библиографический

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

указатель трудов Белорусского научно-исследовательского института мелиорации и луговодства (1980–2000 гг.)" (2974 (2001 г.)) і "Список опубликованных работ сотрудников факультета мелиорации и водного хозяйства (1991–1998 гг.) (1584 (2002 г.)), Навукова-даследчага інстытута аховы раслін, прысвечанага юбілею арганізацыі "Перечень опубликованных работ сотрудников Белорусского научно-исследовательского института защиты растений за 1971–2000 гг." (2987 (2001 г.)) і іншыя. Тут за аснову ўзяты розныя метадычныя прыёмы складання. Як правіла, усе бібліяграфічныя паказальнікі з'яўляюцца працягам раней існуючых, таму прынцыпы адбору дакументаў, вызначаныя ў папярэдніх выпусках, працягваюць рэалізоўвацца і тут. Яны ўключаюць усе віды апублікаваных навуковых работ, створаных супрацоўнікамі інстытутаў. Аднак ні ў адным з іх не былі адлюстраваны дэпанаваныя рукапісы, якія па статусе прыраўноўваюцца да апублікаваных работ. Прадмовы паказальнікаў таксама адрозніваюцца: акрамя неабходных звестак аб асаблівасцях адбору і групоўкі дакументаў таксама ўключаюцца агляды дзейнасці навуковай установы, апублікаваных прац, гістарычныя этапы развіцця інстытута і іншы матэрыял. Своеасаблівымі з'яўляюцца спосабы размяшчэння матэрыялу. Напрыклад, у паказальніку Інстытута аховы раслін (2987 (2001 г.)) – па лабараторыях. Прычым, у пачатку прыводзіцца кароткая гісторыя лабараторыі, яе кіраўнікі, далей прыводзіцца ўвесь спіс апублікаваных работ па гадах, а ўнутры ў алфавіце аўтараў і загалоўкаў дакументаў. У паказальніку Інстытута меліярацыі і лугаводства (2974 (2001 г.)) матэрыял размяшчаецца ў 2-х вялікіх раздзелах, кожны з якіх змяшчае больш за паўтары тысячы бібліяграфічных запісаў. Найбольш адпавядае методыцы прынятае размяшчэнне матэрыялу ў бібліяграфічным паказальніку Інстытута лесу (3226 (2001 г.)), дзе выдзелены 15 тэматычных раздзелаў, унутры кожнага з іх матэрыял размяшчаецца ў алфавіце аўтараў. Дапаможныя паказальнікі выкарыстоўваюцца адзіныя – гэта алфавітны паказальнік аўтараў, хаця ў бібліяграфічным паказальніку прац супрацоўнікаў Інстытута аховы раслін (2987 (2001 г.)) дапаможныя паказальнікі адсутнічаюць.

Найбуйнейшыя прыкніжныя спісы літаратуры прысутнічаюць у манаграфіях, тэматыка якіх прысвечана розным галінам сельскай гаспадаркі. Яны падрыхтаваны ў розных навуковых установах, напрыклад, у Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, Беларускім дзяржаўным універсітэце, Інстытуце пладаводства і іншых. Колькасць назваў уключаных дакументаў у найбольш значных з іх вагаецца ад 120 да 400. Асобнай увагі заслугоўвае ня толькі вялікі па аб'ёму прыкніжны спіс літаратуры да манаграфіі Дзевятава А. С. "Корневая система плодовых деревьев: яблоня, груша, слива" (4196 (2004 г.)), але і размешчаны ў дадатку "Библиографический указатель работ А. С. Девятова" (4180 (2004 г.)), які ўключае 399 назваў апублікаваных работ гэтага аўтара. Другі спіс літаратуры размешчаны ў кнізе, прысвечанай жыццю і дзейнасці В. І. Шэмпеля "Выдающийся агрохимик Беларуси" (4155 (2004 г.)). Па колькасці адлюстраваных дакументаў ён невялікі, але гэтыя 2 спіса могуць па праву пераўтварыцца ў самастойныя біябібліяграфічныя паказальнікі.

Па-ранейшаму ў патоку бібліяграфічнай прадукцыі адсутнічаюць многія неабходныя віды: галіновыя, тэматычныя, бібліяграфічныя паказальнікі асобных відаў дакументаў і іншыя. Ужо некалькі гадоў не складаюцца вытворча-практычныя і рэкамендацыйныя паказальнікі, хаця асноўныя сельскагаспадарчыя кадры сканцэнтраваны ў сельскай мясцовасці, дзе і без гэтага назіраецца інфармацыйны голад. Такім чынам, можна канстатаваць неабходнасць далейшага ўдасканалення бібліяграфічнай прадукцыі па сельскай гаспадарцы ў нашай краіне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ